Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»**

# ПРАЗ ТВОРЧАСЦЬ – ДА МАЙСТЭРСТВА

*Да 40-годдзя з часу заснавання
ўстановы адукацыі
«Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй
сферы абслугоўвання»*

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне**

Кобрын
2021

УДК 016:377(476.7)
ББК 91.9:74(4Беи)
П68

Серыя заснавана ў 2020 годзе

***Складальнік:***
галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
*С. Д. Курачук*

П68 Праз творчасць – да майстэрства : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 40-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2021. – 52 с. : фат. – (Серыя «Адукацыя на Кобрыншчыне»).

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Праз творчасць – да майстэрства» з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём установы адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання».

**УДК 016:377(476.7)**
**ББК 91.9:74(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2021

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Праз творчасць – да майстэрства» з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне» прысвечана 40-гадоваму юбілею ўстановы адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання».

Гісторыя навучальнай установы непарыўна звязана з гісторыяй усёй прафесійна-тэхнічнай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Чатыры дзесяцігоддзі ў ліцэі рыхтуюць спецыялістаў, навучаюць прафесійным навыкам учарашніх школьнікаў і робяць іх запатрабаванымі. Менавіта запатрабаванасць з'яўляецца своеасаблівай візітнай карткай выпускнікоў ліцэя. Актуальная і канкурэнтназдольная прафесія - першае, што трэба мець для таго, каб упэўнена адчуваць сябе на рынку працы. Кобрынскі ліцэй сферы абслугоўвання - адна з устаноў адукацыі, дзе моладзь атрымлівае надзейную пуцёўку ў жыццё. За 40 гадоў са сцен ліцэя выйшлі тысячы выпускнікоў, якія паспяхова працуюць на прадпрыемствах лёгкай прамысловасці, сферы абслугоўвання, гандлю і грамадскага харчавання ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Праз творчасць – да майстэрства» дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём ліцэя.

Выданне мае наступную структуру:

Ад складальніка

I. З гісторыі

II. Партрэт кіраўніка: *Клачковіч Марыя Мікалаеўна - дырэктар ліцэя (1983-2007)*

III. Ліцэй сёння – гэта актуальна, запатрабавана, цікава

*У нагу з жыццём*

*Запатрабаваныя і кваліфікаваныя*

*З жаданнем рабіць дабро*

Спіс крыніц

Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Выданне прадстаўляе больш за 150 бібліяграфічных крыніц. Уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1982 года. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Выданне змяшчае фотаздымкі розных гадоў з фотаархіва і сайта ўстановы адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання», а таксама з фотагалерэі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

# З ГІСТОРЫІ

Гісторыя Кобрынскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сферы абслугоўвання пачынаецца 7 красавіка 1981 года з загаду Дзяржаўнага камітэта БССР па прафтэхадукацыі і Міністэрства лёгкай прамысловасці БССР № 79/121 «Аб адкрыцці ў г. Кобрыне тэхнічнага вучылішча».

Сваім існаваннем вучылішча абавязана Кобрынскай прадзільна-ткацкай фабрыцы «Ручайка». Будаўніцтва буйнога тэкстыльнага прадпрыемства запатрабавала адкрыцця прафесіянальнай навучальнай установы. Так у



1981 годзе ў горадзе адчыняе свае дзверы тэхнічнае вучылішча № 153, дырэктарам якога быў прызначаны Георгій Віктаравіч Амельянюк.

1 кастрычніка 1981 года пачаўся першы навучальны год. Намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ў той час была Марыя Мікалаеўна Клачковіч, намеснікам дырэктара па вучэбна-вытворчай рабоце - Таццяна Мікалаеўна Талочка.



Новая навучальная ўстанова спачатку размяшчалася на базе вучылішча будаўнікоў № 102. Першы набор склаў 210 навучэнцаў па прафесіях: «прадзільшчыца», «ткач», «памочнік майстра прадзільнай вытворчасці».

Гэта былі кадры для прадзільна-ткацкай фабрыкі, якая яшчэ будавалася. 24 з 60 чалавек першага выпуску 1982 года атрымалі дыпломы з адзнакай.

Вучылішча стваралася практычна на пустым месцы. Нават сама тэрыторыя першапачаткова нагадвала балота. Днём пасля работы настаўнікі і дзеці рабілі ўсё магчымае, каб навесці тут парадак. Вера ў тое, што ствараецца патрэбнае і новае для горада, для моладзі, натхняла і навучэнцаў, і настаўнікаў.



У студзені 1982 года вучылішча атрымала свой інтэрнат, што дазволіла забяспечыць жыллём на перыяд навучання іншагародніх грамадзян.

З 1 лістапада 1983 года па 10 жніўня 2007 года навучальную ўстанову ўзначальвала Марыя Мікалаеўна Клачковіч.

Да пачатку 1984 года былі ўведзены ў эксплуатацыю вучэбны, грамадска-бытавыя корпусы і майстэрні вучылішча. Паралельна з падрыхтоўкай кадраў тэкстыльных прафесій пачалі навучаць швачак для работы на Кобрынскай швейнай фабрыцы. Калектыў стварае вучэбную базу як па прафесіянальнай, так і па агульнаадукацыйнай падрыхтоўцы. Выпускнік павінен атрымліваць высокую кваліфікацыю і быць маральна выхаваным – такая галоўная задача стаяла перад калектывам настаўнікаў. Была наладжана трывалая сістэма навучальна-выхаваўчага працэсу, якая штогод аналізавалася і

карэкціравалася. Шмат для гэтага зрабілі намеснікі дырэктара Л. Жук, Т. Талочка, М. Уласевіч, Н. Бандарук, В. Букач.

З 1 верасня 1984 года вучылішча было рэарганізавана ў сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча, у сувязі з чым наступныя два гады ішло асваенне вучэбнага комплексу і афармленне кабінетаў.

З 1985 года зарабілі ткацкія майстэрні пад кіраўніцтвам старшага майстра Л. А. Шышко, прадукцыя якіх карысталася попытам у насельніцтва.

Вучылішча прымае ўдзел у абласных і рэспубліканскіх кірмашах, выставах, конкурсах сярод прафтэхвучылішч. Штогод праходзяць выставы дэкаратыўна-прыкладной і мастацкай творчасці. Работы майстроў вытворчага навучання А. Р. Хрушч, Н. С. Радзівіновіч і іншых адзначаліся граматамі і дыпломамі Міністэрства адукацыі.




У 1985 годзе Дзяржаўным камітэтам БССР па прафтэхадукацыі інтэрнату вучылішча прысвойваецца ганаровае званне «Інтэрнат высокай культуры». Інтэрнат уяўляе сабой пяціпавярховы корпус блочнага тыпу, у якім створаны ўмовы ў адпаведнасці з санітарнымі нормамі і правіламі. Пакоі для адпачынку, санітарна-бытавыя пакоі, памяшканні для пра-

вядзення заняткаў па інтарэсах, для самападрыхтоўкі,



актавая зала, кабінет маладзёжных грамадскіх



аб'яднанняў - увесь гэты комплекс памяшканняў размяшчае інтэрнат.

З 1986 года ў навучальнай установе штогод сталі праходзіць выставы тэхнічнай і мастацкай творчасці, конкурсы прафесійнага майстэрства. Экспанаты выстаў неаднаразова ўдзельнічалі ў абласных і рэспубліканскіх аглядах. З 1988 года традыцыйным стаў конкурс на лепшы пакой і лепшы паверх. Вялікая ўвага надавалася арганізацыі спаборніцтваў паміж групамі.



У 1988 годзе навучальная ўстанова атрымлівае званне «Вучылішча высокай культуры», а праз два гады за высокія паказчыкі ў рабоце калектыў быў узнагароджаны пераходным сцягам Савета Міністраў і Міністэрства народнай адукацыі БССР.

Самымі цяжкімі ў развіцці вучылішча былі 1990-я гады. Падзенне эканамічнага патэнцыялу лёгкай прамысловасці ў краіне, скарачэнне штату рабочых на

прадзільна-ткацкай фабрыцы адбіліся і на стане ўстановы. Трэба было тэрмінова шукаць іншыя падыходы. Пачалі ўважліва вывучаць рынак працы, каб даць моладзі прафесіі, запатрабаваныя часам. Паступова зніжаючы набор і падрыхтоўку па тэкстыльных спецыяльнасцях, упершыню ў Беларусі сталі вучыць моладзь такім новым прафесіям, як «сацыяльны работнік», «страхавы агент», «агент па забеспячэнні і збыце», «прадпрымальнік». Імкнучыся глядзець на



перспектыву, у 1999 годзе адкрылі ліцэйную групу з фізіка-матэматычным ухілам па кваліфікацыях «швачка», «кравец», у 2003 годзе - «аператар ЭВМ».

Усё гэта, безумоўна, садзейнічала павышэнню прэстыжу вучылішча. Спроба аказалася ўдалай - навучальная ўстанова не толькі выстаяла ў няпростыя часы перабудовы, але і стала прыкладам для іншых. Прыём навучэнцаў пачаў здзяйсняцца на конкурснай аснове. Значна павялічыўся ўзровень падрыхтаванасці вучняў. Яны гучна заяўляюць пра сябе на раённых і абласных алімпіядах, установай цікавяцца падобныя вучылішчы з іншых рэгіёнаў Беларусі.

# ПАРТРЭТ КІРАЎНІКА

***Клачковіч Марыя Мікалаеўна - дырэктар ліцэя (1983-2007)***



**Марыя Мікалаеўна Клачковіч** двадцаць чатыры гады ўзначальвала навучальную ўстанову і разам з ёй прайшла ўвесь няпросты шлях ад тэхнічнага вучылішча тэкстыльшчыкаў да дзяржаўнага ліцэя сферы абслугоўвання. На працягу ўсіх гэтых гадоў пад яе кіраўніцтвам фарміравалася вучэбна-матэрыяльная база і педагагічны калектыў навучальнай установы, якая сапраўды стала неадʼемнай часткай яе жыцця, яе багатай на падзеі біяграфіі. Дарэчы, у дырэктарскім корпусе сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі Брэстчыны Марыя Мікалаеўна на працягу многіх гадоў была адзінай жанчынай.

Настаўніцкую дзейнасць пачала ў 1965 годзе піянерскай важатай у Лясковіцкай 8-гадовай школе Іванаўскага раёна пасля няўдалай спробы паступіць у Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна. Паспяховае (праз год) паступленне на хіміка-біялагічны факультэт таго ж педінстытута ператварыла намеры ў рэальнасць.

У Бельскай базавай школе Кобрынскага раёна Марыя Мікалаеўна рабіла свае першыя крокі ў прафесіі –

выкладала хімію і біялогію. З 1969 па 1981 год працавала настаўнікам, дырэктарам Бельскай васьмігадовай школы.

З 1981 года М. М. Клачковіч працавала ў Кобрынскім прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 153 тэкстыльшчыкаў: спачатку намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, з лістапада 1983 года па ліпень 2007 года з'яўлялася яго дырэктарам. Работа на пасадзе дырэктара ліцэя сферы абслугоўвання, якой было аддадзена шмат гадоў, стала сэнсам яе жыцця. З камандай аднадумцаў рабіла ўсё, каб ліцэй быў лепшым не толькі ў вобласці, але і ў рэспубліцы.



Пад кіраўніцтвам М. М. Клачковіч стваралася і ўмацоўвалася вучэбна-матэрыяльная база для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных рабочых. Уся яе працоўная дзейнасць была накіравана на ўдасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу, стварэнне ўмоў для развіцця асобы навучэнцаў, аптымізацыю метадычнай і выхаваўчай дзейнасці калектыву. Марыя Мікалаеўна з'яўлялася членам метадычнага савета ліцэя, ініцыятарам укаранення ў вучэбна-выхаваўчы працэс сучасных тэхналогій навучання і выхавання, камп'ютарнай тэхнікі.

З пасады дырэктара ліцэя М. М. Клачковіч пайшла ў 2007 годзе, пакінуўшы пасля сябе цвёрды падмурак, які застаецца сённяшняму кіраўніцтву і працоўнаму калектыву ўмацоўваць і ўдасканальваць. Яшчэ амаль дзесяць гадоў

яна працягвала педагагічную дзейнасць, працуючы ў якасці інспектара па кадрах і выкладчыка.

Грамадская дзейнасць заўсёды была неад'емнай часткай жыцця Марыі Мікалаеўны: сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса «За Радзіму» Кобрынскага раёна, дэпутат мясцовага Савета народных дэпутатаў, прапагандыст маладзёжнага гуртка камбіната грамадскага харчавання, старшыня прафкама прафсаюзнай арганізацыі аддзела адукацыі. Неаднаразова М. М. Клачковіч з'яўлялася старшынёй ці намеснікам старшыні ўчастковай выбарчай камісіі.

За высокі прафесіяналізм, творчасць і наватарскі падыход у навучанні і выхаванні працоўных кадраў Марыя Мікалаеўна Клачковіч узнагароджана значком «Выдатнік прафтэхадукацыі БССР», Ганаровым знакам «За заслугі ў развіцці прафтэхадукацыі», Ганаровымі граматамі ўпраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 410 ад 31 ліпеня 2002 года ёй прысвоена званне «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь».

У дзень 75-годдзя Кобрынскага раёна М. М. Клачковіч удастоена звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» (рашэнне Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 13.01.2015 г., № 37).

Прафесіяналізм і любоў да сваёй справы - аснова кіраўніка-лідара Марыі Мікалаеўны Клачковіч, выдатніка прафтэхадукацыі, заслужанага настаўніка Рэспублікі Беларусь, ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна.

# ЛІЦЭЙ СЁННЯ – ГЭТА АКТУАЛЬНА, ЗАПАТРАБАВАНА, ЦІКАВА




## *У нагу з жыццём*

На падставе загаду ўпраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама № 445 ад 17 лістапада 2003 года «Аб зацвярджэнні Уставаў устаноў адукацыі са змяненнямі і дапаўненнямі, ліцэнзавання адукацыйнай дзейнасці», экспертнага заключэння Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 9 сакавіка 2004 года Кобрынскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 153 тэкстыльшчыкаў 1 красавіка 2004 года пераўтворана ва ўстанову адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання». З гэтага часу перад установай адкрыліся больш шырокія перспектывы, а вытворча-навучальны працэс выйшаў на новы якасны ўзровень. Былі наладжаны сувязі з каледжамі і тэхнікумамі лёгкай і харчовай прамысловасці з мэтай

ільготнага паступлення і наступнага навучання там лепшых выпускнікоў ліцэя. Паступова да ліцэя вярнулася былая слава.

Рынак працы не стаіць на месцы, і для таго, каб выпускаць патрэбных спецыялістаў, неабходна ўвесь час трымаць руку на пульсе жыцця. Патрабаванні часу вылучалі падрыхтоўку сацыяльных работнікаў, агентаў камерцыйных, агентаў страхавых, прадаўцоў харчовых, прадаўцоў нехарчовых тавараў, швачак-краўцоў, аператараў ЭВМ. З 2008-2009 навучальнага года ў ліцэі ажыццяўляецца падрыхтоўка па новай прафесіі - «камплектоўшчык дэталяў цацак» для патрэб ВП «Палессе». З 2014-2015 навучальнага года ўведзена падрыхтоўка па прафесіі «Цырульнік».







У 2018 годзе рэканструяваны былыя ткацкія майстэрні. На іх месцы створаны кабінеты і навучальныя лабараторыі па спецыяльнасці «Грамадскае харчаванне».

За гады існавання ўстановы падрыхтаваны тысячы кваліфікаваных рабочых, якія працуюць на прадпрыемствах і фірмах Брэсцкай вобласці і рэспубліцы. Выпускнікі ліцэя атрымліваюць першыя працоўныя месцы на такіх прадпрыемствах, як ААТ «Баранавіцкая швейная фабрыка», філіял ААТ «Магатэкс» у г. Кобрыне, ААТ «Элема», ААТ «Кобрын-Сэрвіс», ААТ ГП «Надзея», ПУГВП «Нашы вытокі» і інш. У сярэднім каля 40% выпускнікоў застаецца ў Кобрыне і раёне, 30% размяркоўваюцца ў горад Брэст. Штогод у навучальнай установе навучаецца больш за 10 дзяцей-сірот, якіх размяркоўваць у тыя населеныя пункты, у якіх яны атрымліваюць сацыяльнае жыллё.

Пераход да рынавчных адносінаў у эканоміцы патрабуе пастаяннага ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі кадраў. Пераарыентацыя і хуткая адаптацыя ўстановы ў новых эканамічных умовах – своеасаблівая сур’ёзная праверка прафесіяналізму педагагічнага калектыву.

Кобрынскі ліцэй сферы абслугоўвання заўсёды высока трымае сваю планку. Лепшай характарыстыкай з’яўляецца лідзіруючая пазіцыя ліцэя ў конкурсе на лепшую ўстанову прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі Брэстчыны. За перамогу ў спаборніцтве за дасягненне найлепшых вынікаў у выкананні паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Кобрынскі дзяржаўны






прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання быў занесены на Дошку гонару Брэсцкай вобласці.

Ліцэй са знакам якасці – гэта перамога ўсяго калектыву – педагогаў, майстроў, навучэнцаў – усіх, хто кожны дзень працуе над тым, каб рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, прафесіяналаў, гатовых да стваральнай працы на карысць людзям.




Творчы, згуртаваны і працаздольны калектыў педагогаў і работнікаў ліцэя працуе сёння над стварэннем умоў для павышэння якасці адукацыі, рэалізацыі навучэнцамі сваіх здольнасцей, набыцці імі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, задавальнення патрэбаў грамадства і дзяржавы ў кваліфікаваных кадрах.

Высокая якасць штодзённай працы ўчарашніх выпускнікоў на сваіх рабочых месцах - самая лепшая ўзнагарода калектыву ліцэя. Дарэчы, многія з выпускнікоў працягваюць адукацыю далей і вяртаюцца ў альма-матэр, цяпер ужо, каб вучыць іншых.

Вялікі ўклад у выхаванне і прафесійную падрыхтоўку навучэнцаў ўнеслі цяперашнія ветэраны працы: Лідзія Мікалаеўна Жук, Ніна Васільеўна Бандарук, Ніна Сцяпанаўна Радзівіновіч, Алена



Ягораўна Сталярова, Марыя Іванаўна Уласевіч, Вольга Андрэеўна Хурсіна, Лілія Андрэеўна Шышко і многія інш. Гэтыя педагогі заўсёды ставіліся да сваёй працы з вялікай адказнасцю і працавітасцю.

Пераняў ад М. М. Клачковіч эстафету кіравання Віктар Сцяпанавіч Нічыпарук. З 10 жніўня 2007 года і па цяперашні час ён з’яўляецца дырэктарам ліцэя. Уласны ўклад В. С. Нічыпарука ў развіццё сістэмы прафтэх-адукацыі вымяраецца 40 гадамі работы ў дадзенай сферы, пацвярджаецца шмат-



лікімі ўзнагародамі. У 2015 годзе Віктар Сцяпанавіч удастоены нагруднага знака «Выдатнік адукацыі». У 2017 годзе ён стаў пераможцам абласнога конкурсу «Лепшы дырэктар установы прафесіянальнай адукацыі». Па выніках конкурсу В. С. Нічыпарук набраў максімальную колькасць балаў і быў узнагароджаны сертыфікатам «Залаты дырэктар» і Ганаровай граматай.

І сёння актуальнасць прафесій, запатрабаванасць на працоўным рынку з’яўляюцца галоўным крытэрыем

падрыхтоўкі моладзі ў ліцэі сферы абслугоўвання. Са сцен навучальнай установы выходзяць кваліфікаваныя повары грамадскага і дзіцячага харчавання, афіцыянты, прадаўцы, аператары электронна-вылічальных машын, швачкі, краўцы, цырульнікі, камплектоўшчыкі дэталяў цацак.

Ліцэй паспяхова выконвае план набору навучэнцаў,  дзякуючы сістэме работы, якая склалася ва ўстанове і сябе апраўдвае. Тут праводзяцца прафарыентацыйныя мерапрыемствы, дні адкрытых дзвярэй, тыдні прафесій. Адрадзілі такую форму работы, як агітбрыгада. Яе ўдзельнікі выступаюць у школах з рэкламнымі пастаноўкамі, падчас якіх праводзіцца знаёмства патэнцыяльных навучэнцаў з умовамі ліцэя, паведамляецца пра магчымасці далейшай вучобы ў ВНУ і перспектывы працаўладкавання. Невыпадкова, што план набору па некаторых прафесіях выконваецца задоўга да канца ўступнай кампаніі.

Важным паказчыкам работы ўстановы з’яўляецца паспяховая сацыялізацыя навучэнцаў, іх размеркаванне і працаўладкаванне. Больш высокую кваліфікацыйную катэгорыю навучэнцы атрымліваюць, наведваючы факультатыўныя заняткі і творчыя аб’яднанні. Усе жадаючыя падчас навучання па асноўнай спецыяльнасці могуць за кошт уласных сродкаў набыць іншую прафесію. Напрыклад, повар можа вывучыцца на бармэна, а аператар ЭВМ - на цырульніка. Заняткі такіх груп

праходзяць у вячэрні час на базе прадпрыемстваў горада, якія з'яўляюцца даўнімі партнёрамі ліцэя.

Яшчэ адна адметная рыса ліцэя – гэта наяўнасць умоў для навучання і эфектыўнай сацыяльна-працоўнай адаптацыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Можна смела сцвярджаць, што калектыў ліцэя з'яўляецца ў гэтым плане наватарам. Педагагічны калектыў распрацаваў і ўкараніў сістэму навучання дзяцей з інваліднасцю. Усе асаблівыя выпускнікі, якія выходзяць са сцен ліцэя, працуюць па набытых спецыяльнасцях.



У шосты школьны дзень на базе ліцэя 85 вучняў школ горада і раёна атрымліваюць рабочыя прафесіі па дзвюх спецыяльнасцях - швачка і афіцыянт.

Як і кожная навучальная ўстанова, ліцэй сферы абсугоўвання ўвесь час развівацца, адкрывае новыя спецыяльнасці па запатрабаваных прафесіях. Паводле пяцігадовага плану развіцця сістэмы прафтэхадукацыі ў 2022 - 2023 навучальным годзе плануецца ўвесці яшчэ адну новую інтэграваную спецыяльнасць.

Установа адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання» дае сваім навучэнцам магчымасць атрымаць адукацыю такога ўзроўню, якая стане асновай іх паспяховай сацыялізацыі як грамадзяніна і прафесіянала.

## *Запатрабаваныя і кваліфікаваныя*

Сёння самай лепшай узнагародай для усіх педагогаў ліцэя з’яўляюцца шматлікія дасягненні навучэнцаў. Дарэчы, сваіх першых поспехаў яны дабіваюцца яшчэ ў працэсе вучобы. З году ў год займаюць прызавыя месцы на раённых, абласных і рэспубліканскіх конкурсах і злётах.



Навучэнцы ліцэя з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі і пераможцамі конкурсаў прафесійнага майстэрства.

Калекцыі мадэляў адзення, выробленыя навучэнцамі і майстрамі вытворчага навучання, дэманстраваліся на подыумах не толькі Беларусі, але і за яе межамі,



неаднаразова адзначаліся дыпломамі рэспуб-



ліканскіх выстаў тэхнічнай і мастацкай творчасці.

Калектыў ліцэя з'яўляецца пастаянным удзельнікам абласнога фестывалю дэкаратыўна-прыкладной і мастацкай творчасці «Беларускі вянок». У 2008 годзе калекцыя «Нотный стан или уроки весны» атрымала дыплом І ступені абласнога этапу гэтага фестывалю. У 2010 годзе калекцыя вячэрняга адзення атрымала дыплом ІІІ, а калекцыя народнага адзення - І ступені абласнога этапу фестывалю «Беларускі вянок».



На раённых алімпіядах у 2008-2009 навучальным годзе навучэнцы ліцэя занялі першае і другое месца па абслуговай працы, першае месца - па інфарматыцы. 50% навучэнцаў, якія прынялі ўдзел у алімпіядах, увайшлі ў дзясятку лепшых. Падзячны водгук атрыманы па выніках ІІІ этапу рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы.



Па выніках трохдзённага Міжнароднага фестывалю рэстаранных тэхналогій BestCookFest-2019, які ў канцы кастрычніка 2019 года прайшоў у Чарнаўцах (Украіна), навучэнец Кобрынскага ліцэя сферы абслугоўвання Андрэй Маеўскі атрымаў сярод юніёраў два бронзавыя і сярэбраны медалі. Юнак, чыю перамогу лёгкай не назавеш (у спаборніцтве ўдзельнічала больш за 500

кухараў з 17 краін), здзівіў журы не толькі арыгінальнымі смакавымі якасцямі згатаваных страў, але і іх цікавай прэзентацыяй.

Ва ўстанове захаваліся добрыя традыцыі, звязаныя, у першую чаргу, з раскрыццём асобы кожнага выхаванца. Заняткі ў гуртках, спартыўныя спаборніцтвы, конкурсы, экскурсіі па памятных мясцінах Беларусі і замежжа - толькі



нешматлікія формы работы, якія дапамагаюць арганізаваць



вольны час навучэнцаў. Кожны мае магчымасць развіваць свае здольнасці, схільнасці і інтарэсы. У ліцэі працуюць 36 аб’яднанняў па інтарэсах маральна-ідэалагічнай, мастацкай, спартыўна-аздараўленчай і дэкаратыўна-прыкладной накіраванасці.

Традыцыйнымі сталі: першы ўрок новага навучальнага года, прысвечаны тэме «Мая Беларусь», агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці сярод груп ліцэя «Любімай Беларусі - энергія і творчасць маладых», спартыўнае свята «Здаровы я - здаровая краіна»; тыдні прафесій швейнай вытворчасці, грамадскага харчавання, гандлёвага профілю; прапаганда здаровага ладу жыцця, прававых ведаў; конкурсы «Лепшая група ліцэя», «Самая спартыўная група» і інш. Навучэнцы ліцэя актыўна

ўдзельнічаюць у навукова-практычных канферэнцыях, паспяхова прымаюць удзел у абласным конкурсе па грамадзянска-патрыятычным выхаванні «Спадчына», у рэспубліканскім конкурсе «Я выбіраю прафесію маркетолага» і інш., неаднаразова становяцца пераможцамі гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў па розных відах спорту.

З зацікаўленнасцю навучэнцы займаюцца вывучэннем традыцый свайго народа. У 2010 навучальным годзе ў інтэрнаце ліцэя распачаў сваю работу клуб «Спадчына», асноўным кірункам дзейнасці якога з'яўляецца знаёмства з вырабамі дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, народнымі музычнымі інструментамі, гісторыяй беларускага нацыянальнага касцюма і інш. Адным з цікавых напрамкаў работы клуба з'яўляецца знаёмства з народнымі і рэлігійнымі святамі і абрадамі беларусаў.

Штогод навучальная ўстанова адзначаецца сваімі перамогамі на конкурсах, аглядах і фестывалях самага разнастайнага ўзроўню і ў самых разнастайных накірунках. Навучэнцы шыюць выдатныя калекцыі адзення, выступаюць на алімпіядах, танцуюць, спяваюць, гуляюць у КВЗ - і ўсюды дабіваюцца поспехаў, уздымаючы аўтарытэт ліцэя ўсё вышэй і вышэй. А потым, атрымаўшы прафесію, авалодаўшы ўсімі неабходнымі навыкамі і ўменнямі, уліваюцца ў жыццё кваліфікаванымі спецыялістамі і сапраўднымі грамадзянамі. І, як бы ні склаўся іх далейшы лёс, не забываюць ліцэй, які даў ім першую пуцёўку ў вялікае жыццё.

# З жаданнем рабіць дабро

Большасць навучэнцаў Кобрынскага ліцэя сферы абслугоўвання з задавальненнем атрымліваюць прафесію і займаюцца ў вольны ад урокаў час цікавымі справамі. Больш за 10 гадоў у ліцэі існуе валанцёрства. За гэтыя гады на рахунку валанцёраў тысячы добрых спраў.




Гісторыя валанцёрскага руху ў навучальнай установе бярэ свой пачатак з лістапада 2009 года, калі была створана валанцёрская група Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца «Aliies inserviendo», што значыць «дапамагаю іншым». У верасні 2014 года група змяніла сваю назву, і сёння гэта добраахвотніцкая арганізацыя «Будзь з намі». Менавіта гэты выраз як нельга лепш вызначае сутнасць валанцёрскага руху. У спісе добрых спраў удзельнікаў арганізацыі «Будзь з намі» - аказанне сацыяльнай дапамогі дзецям-інвалідам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, праца з людзьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, дапамога адзінокім і састарэлым людзям ва ўбор-

цы ўраджаю і навядзенні парадку на прысядзібных участках. Не застаецца па-за ўвагай і сацыяльная праблематыка: валанцёры праводзяць флэш-мобы па




супрацьдзеянні шкодным звычкам і прапагандзе здаровага ладу жыцця, інфармуюць іншых навучэнцаў аб ролі валанцёрства. Традыцыйным стаў удзел валанцёраў у акцыях «Нашы дзеці», «Дзякуй за Перамогу», «Ад сэрца да сэрца», «Чалавек з белым кіем» і многіх іншых мерапрыемствах, якія нясуць дабро і радасць






тым, хто побач з намі. Сёння валанцёраў ліцэя добра ведаюць у Кобрынскім дзіцячым доме, Цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, у аддзяленнях дзённага знаходжання для інвалідаў і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН, на падворках ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і проста пажылых людзей, якія маюць патрэбу ў дапамозе і ўвазе.

Валанцёрская арганізацыя ліцэя сферы абслугоўвання «Будзь з намі» аб'ядноўвае навучэнцаў самага шырокага спектру інтарэсаў і памкненняў, а з кожнай новай акцыяй ці мерапрыемствам у яе складзе з'яўляюцца новыя асобы, захопленыя выдатным жаданнем дапамагаць іншым і дзяліцца цяплом свайго сэрца.








**За 40 гадоў сваёй гісторыі Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання прайшоў вялікі шлях у сваім развіцці.**

**І сёння ліцэй жыве поўным і насычаным жыццём, дынамічна развіваецца і не спыняецца на дасягнутым.**

# СПІС КРЫНІЦ

**Юбілейныя** даты ўстаноў адукацыі. Установе адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання» (1981) – 40 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 31.

**Ганаровыя грамадзяне Кобрынскага раёна. Клачковіч Марыя Мікалаеўна** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020. – С. 41-43.

**Заслужаныя настаўнікі. Клачковіч Марыя Мікалаеўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 109-110 : фат.

**Пашкович, Л.** Вкусная победа / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. – 2021. – 20 сакавіка. – С. 10.

Очередную победу кобринскому лицею принес областной конкурс профессионального мастерства.

**Бялоў, Д**. Майстры на ўсе рукі / Дзмірый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2020. – 22 лютага. - С. 9.

У ліцэі арганізавана выстава «Паміж мінулым і будучым», на якой паказаны работы навучэнцаў і майстроў установы.

**Ничипорук, В. С.** Виктор Ничипорук: «Задача профтехобразования дать человеку востребованную профессию» / Виктор Ничипорук ; [беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. - 19 ноября (№ 47). - С. 2.

**Пашкович, Л.** Красота на тарелке / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2020. - 28 лістапада. – С. 4.

В кобринском лицее учат не только вкусно готовить, но и красиво, нестандартно подавать блюда.

**Пашкович,** Л. Кулинарная неделя / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2020. – 28 лістапада. – С. 1.

В лицее прошла неделя общественного питания, посвящённая профессии повара и тому, что с ней связано.

**Пашкович, Л.** Молекулярная кухня: искусство в граммах / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2020. - 18 лістапада (№ 89). - С. 5 : фот.

В кобринском лицее сферы обслуживания постигают технологии молекулярной кухни.

**Савчук, М.** Листая страницы истории / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. - 19 ноября (№ 47). - С. 2.

История образования лицея сферы обслуживания.

**Савчук, М.** Нитка, иголка и вдохновение / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. - 11 июня (№ 24). - С. 4.

Экс-директор кобринского лицея М. Н. Клочкович, находясь на пенсии, посвятила себя творчеству вышивки картин.

**Ализар, К.** Покоритель кулинарного Олимпа / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. - 2019. - 2 лістапада. - С. 9.

Учащийся лицея А. Маевский одержал победу на международном фестивале ресторанных технологий.

**Бакун, Е.** Сделай выбор сегодня / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. - 29 чэрвеня. - С. 9 : фот.

**Грышкевіч, С.** Кулінарны гуру з Кобрына / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2019. - 14 лістапада. - С. 13 : фот.

Навучэнец Кобрынскага ліцэя сферы абслугоўвання А. Маеўскі — сярод пераможцаў Міжнароднага фестывалю рэстаранных тэхналогій.

**Грэчка, І.** На выдатна з плюсам / Ігар Грэчка // Настаўніцкая газета. - 2019. - 25 чэрвеня. - С. 8 - 9.

Сацыялізацыя навучэнцаў, іх размеркаванне і працаўладкаванне - галоўны паказчык паспяховай работы кобрынскага ліцэя.

**Елизарова, Ж.** Вкусно, красиво, доступно, грамотно / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. - 18 мая. – С. 9.

Областной конкурс профмастерства поваров выиграл учащийся кобринского лицея Андрей Маевский.

**Елізарава, Ж.** Кобрынскі ліцэй – лепшы ў вобласці / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2019. - 9 студзеня. - С. 1,5.

**Пальто, К.** Мастера запечатлевать прекрасное / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2019. - 9 студзеня. – С. 5.

